БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі: Серпухоўская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поўдня. Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаўкай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш петыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 52. Менск. Аўторак 28 мая 1918 г. Год I

Менск 28/v.

— —

«Кадэтская» партыя у Расіі заўсёды была працівнікай «тройхаўрусу» і стаяла за зближэнне Расіі з Англіяй. Міністр заграпічных справаў, найбольш блізкі да кадэтскіх колаў член царскага ураду, Сазоноў, паклаў шмат высілкаў для «руска-ангельскага зближэння», каторае вылілося у руска-ангельскую згоду, было аднэй с прычын прысьпяшыўшых эўропэйскую вайну. У «міністэрствах рэволюцыі» —Гучкова і Керэнскаго, «кадэты» былі той сілай якая цягнула Расію да далейшай учасьці у вайне, ні глядзя на запанаваўшы безлад, — абыб астацца вернымі Англіі і Францыі.

У увутраных справах Расіі кадэты былі той сілай каторая увесь час стаяла за «еднасьць і нідзялімасьць» Расіі і разам з большэвікамі, а часамі і горэй, выступалі проці усілкаў, складаўшых даўнейшую імпэрыю, нацыяў да рэяльнаго самаазначэння.

Разгон Кіеўскай Рады большэвікамі гэта тое, але сапраўднае крыху, што коаліцыйнае міністэрство Керэнскаго манілося зрабіць перад сваім упадкам—пасьля абвешчэння украінскай дзержавы.

Цяпер фактычны, ні раздзел дабраволькы, але поўны развал Расіі прымусіў нэўне кадэтаў да перагляду сваей тактыкі, аб чым сьведчаць нікаторыя факты як з жыцця на Украіне так і з Вялікарускаго жыцця.

Дэлегатскі зьезд к.-д. партыі на Украіне прыняў нескольві пастановаў, якія сьведчаць нібыто аб прызнанні кадэтамі нацыянальна-тэрытэрыяльнаго прынцыпу у будове дзержавы.

Зьездам напрыклад была адкінута прапазыцыя нікаторых членаў каб цэнтральны урад к. д. арганізацыяў на Украіне назваць часовым, а так сама адкінуў і папраўку да рэзалюцыі аб патрэбі ураду, што ен істнаваціме да наладжэння стасункаў с даўнейшым цэнтрам, з Вялікарасіі. Далей зьезд большасьцю галасоў (70 проціў 12) адхіліў папраўку аб тым што партыя «астаецца вернай ідэям эдзінства Расіі і па старому трымаецца перакананья у ніабходнасьці хаўрусу с заходнімі дэмократыямі».

А с членаў партыі, уступіўшых у міністэрство гэтмана Скоропадскаго, п. Василенко заявіў на тым-жа зьездзі у сваей прамове: «Інтарэсы нашыя з Нямеччынай заўсёды былі больш жывымі, чым нашыя інтарэсы з Англіяй. Нашы палітычныя інтарэсы з Нямеччынай часта сходзіліся. Але ні можна хаваць і таго што нашыя інтарэсы з Англіяй часта разыходзіліся». І далей: «гісторычныя акалічнасьці зложыліся так, што нашыя гандлевыя і экономічныя інтарэсы зьвязаны с Цэнтральнымі дзержавамі, главным чынам, з Нямеччынай».

Ц. К. партыі у Вялікарасіі на гэта нічога ні кажа, і там так сама кадэты зварочваюцца у бок іншай тактыкі.

С. П.

Альфонс Петрашкевіч, (Ф. Калінка).

20/V—1918 г.

Прыйшла да нас сумная вестка, што 20 г. м скончыўся у засьценку Вінцэнтаво, Крайскай вол., Вілейскаго павету ад запалення плуцу наш малады песьняр А. Петрашкевіч (Ф. Калінка).

Ф. Калінка меў ўсяго 24 гады.

Да апошняго часу, у працяг васьмі гадоў, час—ад-часу, спачатку у «Нашае Ніве», у «Маладой Беларусі і у «Bielarusie», потым у «Вольнай Беларусі» і у «Беларускім Шляху» мы спатыкалі яго селянскія лірычныя вершы.

Пісаў ён вершы так сама пад псеўданімам «Красоўскі.»

Паэзія яго—шчырая, простая, пісанная мазольнаю рукою маладога селяніна-хлебароба. Гэта—скромны салоўка беларускіх зялёных далін, кволаго бярэзьніка ля рэчкі.

Вішнёвы сад, зялёны дубок, язьмін, жаўронак, думкі ратая, бытавыя абразкі засьценковай шляхты—матывы яго паэзіі.

Калінка, кончыўшы толькі народную школу, рваўся да навукі у горад, але варункі жыцця беднаго ратая рэдка каму гэта пазваляюць.

Калінка па ўсей сваей ваколіцы шырыў беларускае друкаванае слово і беларускую ідэю.

Рэдакцыя ад імяні усіх беларускіх пісьменнікаў выказывае свой шчыры сум—жаль бацькам і сваяком без пары спачыўшаго навекі маладого паэта.

Нехай будзе яму пухам зямелька.

Аб „польскім войску“.

Віленскі «Гоман» піша:

БЭРЛІН. «8 Uhr-Abendblatt» піша:

«Калі расійская армія была дэмобілізована і распушчана, салдаты, гаварыўшыя па польску, пачалі злучацца на Украіне ў ваенныя дружыны, с каторых у канцы каннаў утварыўся 2 і 3 польскі корпус. Ні маючы ані грошы, ані яды, гэтыя войскі сцягівалі на сябе ўсе часьцей напасьці акружных селян, каторых страшэнна абурывалі штодзенныя польскія прымусовыя рэквізыцыі. Гэтак дайшло—асабліва ў межах аўстрыяцка-вэнгерскай окупацыі,—да крывавых бітваў між салдатамі 3 польскаго корпуса і украінцамі. Каб ні-дапусьціць далейшаго праліваня крыві, нямецкая і аўстрыяцка-вэнгерская ваенныя каманды, умовіўшыся з украінскім урадам, пастанавілі назначыць палякам на жыцце асобныя памяшчэнні. Адпак трэба было канечна шыбка выясніць міжнароднае палажэнне гэтых польскіх войск. Дзеля забеспечэння нашых опэрацый на Усходзі мы ні маглі сцярпець чужацкіх войск на сваіх тылах. Гэтак сама справа забеспечання гэтых войск грашмі і стравай ставалася ўжо больш пякучай і пачала дрэнна адбівацца на моральнасьці і слухмянасьці салдатоў. На конфэрэнцыі ў Кіеві дзеля закончэння ўсіх нірозвязаных спраў дэлегаты нямецкай і аўстрыяцка - вэнгерскай глаўнай каманды пастанавілі абезброіць гэтыя польскія дружыны і паслаць іх у іхнюю бацькаўшчыну».

Польская гаспадарка на Беларусі

Дзеля характэрыстыкі «слаўных» учынкаў польскаго войска на Беларусі ні будзем падаваць тут такіх фактаў, як поўнае руйнаванне беларускіх вёсак (рэквізыцыя усіх прадуктаў да апошняй крошкі — разам з насеннем), як катаванне «ніпакорных» селян — часта 60 гадовых старых—за тое, што баранілісь ад рабунку ўсяго іх мення, як разстрэлы на аснове нейкаго ні на чым ніаснованаго падазрэння і.г. д: усё гэта арганізованая гаспадарка палякоў на «братняй» зямлі Беларускай. Мы затое перадрукоўваем словы польскай газэты «Dzien. Polski» (№ 134) аб тым, які дух пануе ў гэтай арміі, каторая хваліцца сваім «ладам і слухмянасьцю», апіраючы на гэтым сваё права чыніць суд і расправу над беларускімі селянамі.

«Dz. P.» піша даслоўна:

Польскія салдаты патроху ачышчаюцца ад большэвіцкіх наплываў. Адпак, зарава іщчэ трывае. Здараюцца факты страшэнна балючыя. Напр. месяц таму назад варта абакрала палявую касу 6. палка (113.000 руб.) Напасьці грабежцаў з учасьцем салдатоў ўсё радзей. Грабежцы—ў мундзірах, ці без мундзіраў—ідуць пад палявы суд. На склонах валаў бабруйскай крэпасьці адбылася ўжо ні адна экзэкуцыя».

Польская «чырвоная» армія.

У Вітэбску, захопленым большэвікамі, уся работа беларускіх організацый прыпынілася. Беларускія грамадзкія і палітычныя працаўнікі часьцю разагнаны, часьцю тэрорызованы і прымушаны працаваць патайно, нілегальна. Затоеж шырокі прастор далі большэвікі палякам—так-званаму «1-му польскаму рэвалюцыйнаму полку». І ў Вітэбску народ больш пакутуе ад польскай окупацыі, чым сі ад большэвіцкай. Вітэбская організацыя Беларускай Соцыялістычнай Грамады, старшынёй каторай ў Вітэбску быў М. Мелешка, працуе нілегальна. Ваенная рада разагнана і закрыта.

(Гоман № 41)

Агульныя весткі.

ВЕНА 24/V. „У міністэрстве заграпічных спраў пачаліся учора умовы згоды паміж Аўстро-Вэнгрыі і Фінляндзіі, так-сама аб дадатковым трактату эканамічным і право-палітычным. Кіраўнікам умоваў са стараны Аўстра-Вэнгрыі пастаўлены пасланік фон-Морэй. Поўнамоцнымі ад Фінляндзіі: дзержаўны саветнік Гейльт, Фінляндзкі пасланік у Бэрліне і прафэсар Сэрляшыон, прэдстаўнік у Хрыстыані.

БАЗЭЛЬ 25/V. У японскай верхняй палаце у спрэчках аб шуканні нафту прапанавалі шукаць нафтовых крыніц у Мэксіцы, ні цікавючыся поглядам Амэрыкі. Міністр флота тайнаго адміралтэту—Рат Кото на гэта адпаведаў, што урад хоча шукаць нафту у Мэксіцы, але, дзеля дыплёматычных прычын, ён ні можа казаць аб дэталях.

ШТОКГОЛЬМ 24 гм. Члены фінляндскаго ураду зложылі сваю адстаўку сэнатару Свінхвуду, каторы для сформіравання новаго габінэту запрасіў Паасікідзі. Большасць, аднак, астанецца на сваіх мейсцах.

ЛЕНДАН. 25 гм. «Reuter» урадово паведамляе: Узброены дапаможны крэйсэр «Молдавія» уемкасьцю 9500 тонн, 23 гм. затоплены торпедай. Каманда карабля ні жалела страт у людзях. Загінуло толькі 56 чалавек салдатоў. Трэба дапусьціць, што яны былі забіты ўзрывам у аднэй с каютаў.

ЦУРЫХ. 24 гм. Ангельцы пачалі адход у Мэсопотаміі. Як здаецца ім трудна у часе летніх тропічных упалаў дастаць сваім высунутым далёка пад Багдад залогам патрэбныя для іх рэчы. Над Эффратам так сама даецца зауважыць зварот ангельцаў. Яны падаліся у тыл без бою у кірунку. Гадытш ў 50 вярстах ад Багдаду.

ГААГА. 25 гм. Кабеты Галяндзіі адправілі на гэтых днях да жон вышшага начальства ваюючых стран мірную пэтыцыю‘ каторая ўручана так сама галяндскай каралеве, каралевам другіх нэйтральных дзержаваў і Папежу рымскаму.

РЫМ. 24 гм. Створэно міністэрство достачаня і харчовых спраў. Міністрам назначаны Крысві, таварышам—дэпутат Нунціантэ· Таварыш міністра да спраў марского транспарту Рэджіо узяў адстаўку. Яго мейсцо заступіў дэпутат Сальваторэ Орландо.

ВАШЫНГТОН. 23 г. м. («Reuter») Сэнат прыняў асыгнаванне 600 мільён. доляроў на будову караблёў. Гэта сума на 226 мільён. доляр. перавышае асыгноўку Ніжняй Палаты.

Усе карабельныя заводы штатаў атрымалі прыказ пасьпешыць з работамі, каб у дзэнь сьвяткаваня нізалежнасьці т. е. 4 ліпня можна было спусьціць на ваду стольх караблёў як ніколі ішчэ у гісторыі краю.

ШТОКГОЛЬМ 23 гм. Савецкі урад зьвярнуўся да Японіі з нотай у справе падтрымання японскімі падданымі інтрыгаў рускіх контр-рэвалюцыянэраў. Савецкі урад спадзяецца што Урад Японіі устрымаецца ад якога кольвек умешання у ўнутраныя расійскія справы і адпаведна упльве на сваіх падданых жывучых у Сыбіры.

БЭРЛІН 24 гм. Перад Мурманом стаяць ангельскія і францускія ваенныя караблі. На самым Мурмане высаджэны вайсковыя часьці і нікаторыя з іх пасунуліся да каналу Кшы і нават да Кемі і Сороцкое над Онежскай губой.

ВАШЫНГТОН 23 гм. («Reuter») Урад выдаў распараджэнне каб усе мушчыны да пэўнага веку ад 1 ліпня пайшлі у работу альбо на вайну. Распараджэнне гэтое датыча так сама і працаўнікоў у ніспажытачных вецьвях прамысловасьці. Ім даецца выбар паміж другой працай і вайсковай службай.

РОТТЭРДАМ 24 гм. Асноўваючыся на поўнамоцніцтвах, паданых конгрэсам, Вільсон уволіў усіх с прыватнай службы дырэктараў жалезнічных таварыстваў, каторыя далей будуць лічыцца на гасударсьвенай службе і атрымоўваць меньшыя пэнсіі чым ім плацілі прыватныя таварыства.

На беларускім шляху.

Камандуючым X арміі гэнэралам—ад інфантэрыі фон Фалькенгаймом 27 мая былі прыняты прэдстаунікі Беларускай Рады п. п. Серэда, Аусянік, Варонка, і Алексюк.

У прыватнай бясэдзе выясьніліся спатадныя адносіны нямецкіх уладау.

Далей, у болей падробнай бясэдзе прэдстаунікі мелі магчымасьць пераканацца у тым, што нямецкія аккупацыйныя улады ідуць на сустрэч жаданням Беларускай Рады і нацыянальнаму руху беларускаго народа і што окупацыйныя улады хацелі-бы відзець у Радзе пасрэдніка паміж нямецкімі уладамі і Беларускім народам, для таго, каб па магчымасьці зрабіць лягчэйшымі жыццевыя труднасьці выкліканыя вайной.

Формірованне Сэкрэтарыяту Б. Н. Р. затрымаецца на нейкі час—ні болей 2-х тыдняу—праз выезд члена Рады грамадзяніна Р. Скірмунта на Украіну. Грамадзянін Р. Скірмунт атрымаў надзвычайныя паунамоцніцтва Рады для выпаўнення надта важнай палітычнай місіі на Украіне. Подлуг з выпоўненнем гэтай—місіі ён будзе меть перагаворы з абэцнымі на Украіне беларускімі грамадзкімі дзеячамі, у справе прыняцця імі учасьця у дзержаўнатворчай працы на Беларусі.

На Украіне. Закінутыя далёка ад свае бацькаўшчыны беларусы-ўцекачы і быўшыя ваенныя наладзілі на Украіне акружныя Беларускія Рады ў Харкаве і Кацярынаславе.

Новы украінскі ўрад адносіцца да беларускіх організацый вельмі спагадліва.

Выстаука беларускіх культурных памятнкіау у Вільні лажэная пад кірункам рэдакцыі «Zeutung der 10. Armee», як мы даведаліся, будзе ўжо скоро адкрыта ў доме б. таргова-прамышленаго клюбу (на Лукішках). Работа на мейсцу ужо пачалася.

(«Гоман» № 41).

Беларускі тэатр.

26 мая у Народным Доме імяні Максіма Богдановіча Першым Таварыствам Беларускай Драмы і Камэдыі пастаулены былі камэдыі «Паулінка» і «Міхалка». Спэктакль, пры сярэднім збору, прайшоу добра. Ф. Ждановіча за яго Міхалку вельмі горача выклікалі. У «Паулінцы» ролю пьянаго Пранціся (любімая роля выехаушаго ад нас Янкі Беларуса) спрытна веу Пятровіч, выклікаючы ні раз моцны сьмех публікі.

П. Мядзіолка, у нілічаны раз' здатна нарысавала Паулінку.

Знаемы.

З вясновых праяваў.

(пасьмертны твор).

Праляцела зіма. Сьцюжы, сьнегу німа,
Дожджык цепленькі поле змывае.
С сенажацяў, разор, з усіх ям, з усіх нор
Вада мутная у рэчкі сплывае.

* * *

Рэчкі пеняць, гудзяць і з імпэтам лецяць
Ад тых мейсц дзе радзіліся, морэ;
Хвалі скачуць, пяюць, скаргі сумныя шлюць
Па усім ніаглядным прасторы...

* * *

А на хвалях хоць зрэдзь і ледзянка плывець,
Нібы белая хмарка у блакіце;
Сіраціна яна: гінуць мусіць адна
Без ратунку і у моцы і у спрыце.

* * *

Знаць жыцце на зямлі: паскі точаць з раллі
Рунька кволая зо сну збудзіушысь...
Ужо даволі чэкаць і ні жыць ні канаць
Усю зімку пад сьнегам укрыушысь.

Вінцэнтово. **Ф. Калінка.**

Афіцыяльнае павядамленне нямецкага вярхоунаг[о] камандавання за 27 мая 1918 року.

З А Х А Д: Паўночней Мэтэрэна пры удачным прад[]прыемстві намі узяты у палон ангельцы. Артылерыйска[я] чыннасьць рабілася жывейшай на баявых фронтах тольк[а] после абедныя гадзіны. Непрыяцельская артылерыя найбо[]лей праяўляла сябе у обласьці Кэмэля, на поўночным бера[]зе р. Ліс, паміж Аррасам і Альбертам і на заходным бера[]зе Аўры.

Чыннасьць разьведчыкаў аставалася мацнейшай.

Першы-Генэрал-кватэрмайстар **фон-Людэндорф.**

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

У зноу уладжэным Койдаиоускім павеці выбары у раду поунамоцных ад зямляуласьнікау і зямляробау часьцей Менскаго і Ігуменскаго паветау, а так-сама віленскаго і ашмянскаго пав. Віленскай губ. дзеля вядзення гаспадарскіх спрау адбыліся 24 мая.

Выбары былі скліканы графам Чапскім.

Склад цяперашніх выбарных гласных гарантыруе адлучэнне ад усякай палітыкі / быуш. „Земстве“, рэорганіганізуемым на асобных асновах, с капітальнай перакройкай мапы павету.

Адстаука меськаго галовы Кашчэнко, санкцыяніраваная мейсцовым вышэйшым нямецкім камандаваннем, тлумачыцца у афіцыяльных сфэрах відочным банкроцтвам адміністрацыуна-меськаго апарату у фінансавых палітычных і харчавых адносінах.

Ад учэйрайшаго дня, 27 мая, уступіу на пост б. меські галава Хржонстоускі якога чакае цяжкое заданне па наладжыванню разстроеных фінансау места і харчовай справы.

Нам перадаюць, што з адстаукай Кашчэнко пачнецца рад перамен у нашым меськім самаупрауленні.

Цукер с Украіны у нядзелю 26 мая, быу перавезены са станцыі у распараджэнне меськаго харчавога камітэту для одпуска ад чэрвеня па 2 ф. на душу у месяц.

Мука пшанічная ад чэрвеня мес. будзе выдавацца па бонам па ½ ф. на душу.

У гадаушчыну сьмерці беларускаго паэта М. Богдановіча учора, 27 мая, у катэдральнам саборы была адслужана паніхіда. Было шмат публікі с беларускіх дзеячоу і прыхільнікау го таленту.

Уступленне у абвязкі новаго меськаго войта..

Учора 27 мая у 11 гадз. рана у галоунай меськай радзе (думе) адбылося уступленне у абавязкі новаго Менскаго меськаго войта (гар. галавы) пана Станіслава Хржонстоускаго. Пакуль што гэтую пасаду п. С. Хржонстоускі займае часова. Нямецкі гараднічы п. капітан Гершэль паздаровіу новаго войта з уступленнем у абавязкі.

С прэдстаунікоу горада былі старшыня меськай галоунай рады п. Вайнштэйн, (п. п. Залманау, Цывінскі, а так сама пані Фрумкіна. Пасьля прывітанняу п. С. Хржонстоускі уступіу у спрауленне сваіх абавязкау.

Ад імэні Комэндатуры капітан Генэральнаго Штабу Нігоф сказау што ідзе ніжэй:

«Магістрат і радныя будуць падтрымоуваць новаго гарацк. галаву з усіх сілау у яго нілегкай працы. Вашы учынкі павінны зауседы выходзіць толькі з бажанна дабра для места і інтэрэсау яго жыхароу.

Вашым заданнем зьяуляецца цяпер палепшыць долю горада: які пацярпеу ад вайны і катораго і у будучыне ішчэ чакаюць цяжкія часы. У гэтым напрамку вы зауседы знойдзеце падтрыманне нямецкіх уладау. Уселякая спроба паставіць якія-небудзь перашкоды гэтым замерам і мерам, ідучым на сустрэч толькі дабру грамадзкаму, будзе безумоуна падаулена нямецкімі уладамі.

Па даручэнню Імпэрскаго Канцлера капітан Нігоф абвясьціу пана Хржонтоускаго маючы поунамоцтва на пасаду тымчасоваго гарадзкого галавы.

Эвакуацыя уцекачоу у Польшчу ідзець рэгулярна ва усе дні тыдня, выключаючы ауторка і пятніцы, пры чым цяпер выезжаюць і еурэі (у кожным поездзі ні болей 50 чал.) па хадатайствам еурэйскаго камітэту уцекачоу, каторы толькі нідауна закончыу рэгістрацыйныя спіскі.

Безплатны поезд а 2 гадз. у дзень у Расію касуецца. Выезд у Расію цяпер толькі па білетах, глауным чынам а 4 г. 40 м. па полудні.

На чале беларускай часопісі на нямецкай мове 2 разы у месяц, па сцыяльнай беларуска-крадвай палітыцы, стане член выдавецкаго таварыства «Заранка» А. Н. Упасау.

Часопіс выйдзе пасьля адшуканні памешкання для рэдакцыі. Ва уселякім выпадку ні позьней як у серадзіне чэрвеня.

Аб дажджы, прайшоушым 25-го 26-го мая паласою з ветрам, пры тэмпературы да 12°, паведамляюць пакуль што з мейсцовасьцей на 50 верст ад Менску.

Болей чым пэуны дажджэнед[]

[...] і далей.

Пасевы і расьліны зазеля[]нелі, ажывіліся.

Ад камітэту злучаных работ[]нікау У. З. С. К. З. Ф. выеха[у] у Маскву яго член Менжынін[] па справе аб ліквідацыйны[х] для б. служачых і рабочы[х] мейсцоваго Земсаюза.

Рэгістрацыя кароу, сьвіней[], валоу, авец, і коз пачнец[]ца ад 1 чэрвеня. Заяуляць трэба да 3 чэрвеня—Саборн[ы] пляц, 4.

Гэта—дзеля абезпечэння ме[]ста мясам і малаком.

За непадачы вестак—штраф[] да 1,500 марак.

«Минскій Еженедѣльникъ». У нядзелю, 26 мая, выйшла ча[]сопісь «Минскій Еженедѣл[ь]никъ,—быушая «Минская Газета». Рэдактар-выдавец—М. [] Дворжэц.

Зьмест часопісі жывы і ц[і]кавы сваімі разнаабразным[і] артыкуламі. Агляд менскай кронікі за тыдзень досіць багаты.

У афіцэрскім бюро сягоння[] 28-го мая, рэгістрацыя п[а] апошняму нямецкаму прыказ[у] зробіцца ад № 901 па № 1201.

Сэсія акружнаго суда з уча[]сьцем прысяжных заседаце[]ляу адчыняецца сягоння, 28 ма[я]; скончыцца яна 1 чэрвеня.

Усяго назначано да слухання 16 угалоуных спрау.

Гэта сэсія - першая пасьля акупацыі краю.

Тарговая дэлегацыя с 1[] прэдстаунікау ад таргова-пра[]мыснікау і 3 ад меськаго хар[]чэвога камітэту выезжае сягоння у Расію дзеля арганізацыі зносін па таргоуле мануфактурай, газай, скурамі і др[.] найболей патрэбнымі рэчам[і] у жыцейскім абіходзе. Дэлегацыя верніцца з Расіі ні ранеі як праз месяц.

Запісь на абеды у «Беларускай Хаце» на Конным пляцу адчынена у беларускім народным прэдстауніцтве.

За абед з двух страу—2[]/[] руб., месячно—75 руб.

Арганізатар сталоукі Ф. Вернікоускі.

Б. Пачтова-тэлеграфных чы[н]ноунікау менскаго округа учора, 27 мая, выехала апошняя «жменька» у м. Краснае, Смаленскай губ., г. з. туды, гдзе зноу эвакуіравалося нідауна акружное упрауленне.

У Менску асталіся тольк[і] німногіе с пастаянных асед[]лых агентау п. т. ведамства.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **Т-во «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грынблята.